# Стварэнне арт-аб'екта “Сучасная беларуская інтэр'ерная лялька” і распрацоўка тэхналагічнай карты па яго вырабу



| № | **Апісанне работы** | **Інструменты і прыстасаванні для работы** | **Фота** |
|---|---|---|---|
| 1 | Да распрацоўкі эскіза лялькі нас падштурхнула творчае натхненне | Лінейка, аловак, гумка, тачылка, ліст паперы фармата А4 |  |
| 2 | Распрацоўваем эскіз лялькі. Малюем дэталі | Лінейка, аловак, гумка, тачылка, ліст А4 |  |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 3 | Малюем эскіз сукенкі (палову) | Лінейка, аловак, гумка, тачылка, ліст А4 |  |
| 4 | Ствараем эскіз сукенкі (цалкам) | Лінейка, аловак, гумка, тачылка, ліст А4 |  |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 5 | Распрацоўваем драўляны макет лялькі | Лінейка, аловак, гумка, тачылка, ліст А4 |   |
| 6 | Пры дапамозе клею прымацоўваем тканіну на аснову з МДФ-пліты | Адрэз ільняной тканіны з арнаментам, клей, аснова з МДФ-пліты |  |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 7 | Вырабляем каркас | Стрыжань, аснова |  |
| 8 | Выконваем туга заплеценыя касічкі для рук на аснове з меднага дроту | Ільняныя і шарсцяныя ніткі, медны дрот |  |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 9 | Прымацоўваем валасы, зробленыя з шарсцяных нітак, пры дапамозе клею да балванкі, а на іх прыклейваем капейку | Драўляная балванка, клей, шарсцяныя ніткі, капейка |   |
| 10 | Мялюем твар лялькі | Рознакаляровыя алоўкі, гумка, тачылка, гелевыя ручкі, балванка і сасновы стрыжань |   |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 11 | Пляцем валасы ў дзве касы; адну з іх упрыгожваем кветачкамі з саломкі і калоссем аўса (лета, восень), другую – бліскучымі заколкамі (зіма) | Клей, кветачкі з саломкі, калоссе аўса, бліскучыя заколкі |   |
| 12 | Выразаем магнітны кружочек, які супадае па дыяметры з капейкай, прыклейваем на яго сабраную складкамі тасьму з арнаментам такім чынам, каб атрымаўся капялюшык | Тасьма з арнаментам, клей, гнуткі магніт, нажніцы, беларуская капейка |   |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 13 | Пры дапамозе клею прымацоўваем каласкі і кветачкі да капялюшыка | Клей, каласкі аўса, кветачкі і лісцікі з саломкі |   |
| 14 | Малюнак прымацоўваецца пад празрыстай асновай, на якую наносіцца клей. У тэхніцы “квілінг” на клеявую аснову выкладваюцца ільняныя ніткі | Клей, ільняныя ніткі, поліэтыленавая празрыстая аснова, эскіз узору сукенкі |  |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 15 | Надаем сукенцы форму конуса, надзяваем яе на стрыжань. Пры дапамозе клею ўпрыгожваем яе пацеркамі, блакітным бісерам, белымі, срабрыстымі, карычневымі бусінамі, саламянымі кветачкамі, калоссем аўса, такім чынам, каб пры павароце сукенкі паступова змяняліся прыкметы кожнай пары года | Клей, ільняныя і шарсцяныя ніткі, нажніцы, эскіз узору сукенкі, элементы для ўпрыгожвання аддзення (бісер, пацеркі, кветачкі з саломкі, калоссе аўса) |   |
| 16 | Атрымалася гатовая лялька | |   |